при предоставлении документа об отсутствии средств. В начале 1920-х гг. в условиях значительной инфляции плата за лечение постоянно возрастала, зачастую довольно значительно. Например, 3 марта 1923 г. стоимость больничного обслуживания в соответствии с решением Министерства общественного здоровья поднялась сразу вдвое [5, л. 76].

Экономическая ситуация влияла на здравоохранение Западной Беларуси и в дальнейшем: в годы кризиса конца 1920-х – середины 1930-х гг. падение реальных доходов населения индуцировало соответственное снижение покупательной способности, в том числе и возможностей оплаты за медицинские услуги. Данные тенденции приводили также к снижению доходов врачей, которые получали оплату из средств, вырученных за обслуживание местного населения.

***Заключение***

Результаты проведенного исследования на примере формирования системы здравоохранения в значительной степени характеризуют статус Западной Беларуси в составе Второй Речи Посполитой. Тяжелое гуманитарное и эпидемическое положение, сформировавшееся в результате почти десятилетия непрерывных боевых действий, в течение межвоенного периода продолжало оставаться кризисным на территории Западной Беларуси. Статус «окраинных» земель детерминировал соответственное второстепенное отношение как к выработке организационных основ становления здравоохранения, так и к его материально-техническому и кадровому обеспечению.

**ЛИТЕРАТУРА**


1. *Wasiutyński, B.* Ustrój władz administracyjnych rządowych i samorządowych / B. Wasiutyński. — Poznań: [s. n.]. — 1937. — 160 s.
2. Archiwum Akt Nowych w Warszawie. — Z. 15. — Sygn. 491.
3. Государственный архив Гродненской области. — Ф. 52. — Оп. 1. — Д. 543.
4. Государственный архив Гродненской области. — Ф. 564. — Оп. 1. — Д. 121.
5. Зональный государственный архив в г. Молодечно. — Ф. 4. — Оп. 1. — Д. 434.


**УДК 614.885(091)(476.1-15)“1919/1939”**

# АСАБЛІВАСЦІ ЗАРАДЖЭННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ ПОЛЬСКАГА ТАВАРЫСТВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1919–1939 ГГ.)

***Капліеў А. А.[1], Капліева М. П.[2]***

**[1]Дзяржаўная навуковая ўстанова**
**“Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”**
**г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,**
**[2]Установа адукацыі**
**“Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

***Уводзіны***

Фармаванне сістэмы аховы здароўя на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы на працягу міжваеннага перыяду (1919–1939 гг.) з’яўляецца адной з найменш распрацаваных праблем айчыннай гісторыі. Ва ўмовах цяжкага эканамічнага становішча Заходняй Беларусі значную ролю ў развіцці аховы здароўя адыграла дзейнасць дабрачынных таварыстваў, найбольш уплывовым з якіх стаў Польскі Чырвоны Крыж.

***Мэта***

Ахарактарызаваць зараджэнне і дзейнасць Польскага таварыства Чырвонага Крыжа на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг.

***Матэрыял і метады даследвання***

Артыкул пабудаваны на аснове матэрыялаў дзяржаўных архіваў Беларусі і замежжа, апрацаваных з дапамогай сучасных агульнанавуковых і адмысловых гістарычных метадаў даследавання.



репозиторий ГомГМУ

***Вынікі даследвання і іх абмеркаванне***

Пачатак адраджэння незалежнасці польскай дзяржавы напрыканцы Першай сусветнай вайны суправаджаўся стварэннем уласнай сістэмы аховы здароўя, якая распаўсюдзілася і на тэрыторыі Заходняй Беларусі, канчаткова ўключанай ў склад Польшчы па выніках Рыжскай мірнай дамовы 1921 г.

Аднак арганізаваныя ў Польшчы кіраўнічыя медыцынскія органы (аддзелы, секцыі і, нарэшце, Міністэрства публічнага здароўя) былі цалкам ліквідаваныя як асобныя ўладныя структуры ў 1923 г., а іх кампетэнцыі падзелены паміж міністэрствамі Унутраных спраў і Сацыяльнай апекі. У гэтых умовах адным з асноўных сродкаў падтрымання кампетэнцый структур аховы здароўя стала дзейнасць дабрачынных таварыстваў, найбольш уплывовым з якіх стала Польскае таварыства Чырвонага Крыжа.

Падчас існавання Расійскай імперыі Чырвоны Крыж рэалізоўваў на тэрыторыі Польшчы і Беларусі розныя тыпы медыка-санітарнага забеспячэння грамадзянскага насельніцтва, аднак, пасля прыходу да ўлады бальшавікоў Расійскае таварыства Чырвонага Крыжа было ліквідавана, а яго маёмасць канфіскавана [1, с. 31].

У Польшчы ў мэтах дапамогі войску ў ваенны час 18 студзеня 1919 г. на З'ездзе прадстаўнікоў дзяржаўных, муніцыпальных і ваенных улад і зацікаўленых грамадскіх аб'яднанняў было пастаноўлена стварыць Польскае таварыства Чырвонага Крыжа. Для кантролю над арганізацыяй таварыства ўрадам быў прызначаны адмысловы камісар, якім стаў граф У. Тышкевіч, ўжо меўшы досвед службы ў Расійскім Чырвоным Крыжу падчас Першай сусветнай вайны (малюнак 1) [2, арк. 68 адв.].



**Малюнак 1 — Граф Уладзіслаў Тышкевіч у гады Першай сусветнай вайны. Фотаздымак, 1914–1917 гг.**

Ужо 15 красавіка 1919 г. быў зацверджаны статут таварыства, а фактычная дзейнасць пачалася 4 мая 1919 г. У мірны час Польскае таварыства Чырвонага Крыжа, паводле свайго статуту, дзейнічала па чатырох галоўных накірунках:

1) дапамога ваенным інвалідам;

2) падтрымка грамадзянскіх улад у санітарным наглядзе;

3) супрацоўніцтва з грамадскасцю і аказанне дапамогі пры стыхійных бедствах і катастрофах;

4) падрыхтоўка рэсурсаў для выканання задач Чырвонага Крыжа ў выпадку вайны [3, s. 1].

Репозиторий ГомГМУ

Кіраўніцтва арганізацыі Чырвонага Крыжа ўключала Прэзідыум галоўнага камітэта, Галоўную Раду і Кантрольную Камісію. На выканаўчым узроўні аснову таварыства складалі тэрытарыяльныя акругі і драбнейшыя мясцовыя аддзелы. Значны ўплыў таварыству надаваў факт заступніцтва над ім кіраўнікоў Другой Рэчы Паспалітай, у тым ліку прэзідэнта.

На 1926 г. у Польшчы існавала 14 акруг Чырвонага Крыжа, з якіх беларускія землі ахоплівалі толькі Беластоцкая (11 аддзелаў) і Віленская (2 аддзела). Склалася сітуацыя, калі 363 аддзела Польскага таварыства Чырвонага Крыжа ўтваралі акругі ва ўсіх ваяводствах Другой Рэчы Паспалітай, за выключэннем двух "беларускіх" — Палескага (4 аддзела) і Навагрудскага (7 аддзелаў). Варта адзначыць, што пазней Палеская акруга Чырвонага Крыжа ўсё ж была ўтворана (малюнак 2).




**Малюнак 2 — Мапа "Распаўсюджванне акругаў і аддзелаў Польскага Чырвонага Крыжа на тэрыторыі ўсходніх ваяводстваў Польшчы ў 1920-я гг.". Падрыхтавана аўтарамі на аснове мапы з Нацыянальнага атласу Беларусі (Мн., 2002) паводле арыгінальных матэрыялаў Архіва новых актаў у Варшаве**

У 1929 г. выйшаў дадатковы закон пра паўнамоцтвы Польскага Чырвонага Крыжа, які ўпаўнаважваў яго развіваць установы, меўшыя важнае грамадскае значэнне. Да такіх устаноў адносілася, напрыклад, хуткая медыцынская дапамога, і ужо напрыканцы 1920-х гг. адзначалася, што Польскі Чырвоны Крыж дамогся на гэтым напрамку значных поспехаў.

Трэба адзначыць, што напрыканцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. паразіўшы Польшчу эканамічны крызіс цяжка адбіўся на медыцыне Заходняй Беларусі. Значная частка насельніцтва не магла сябе дазволіць аплату коштаў лячэння ў прыватных лекараў, а таксама ў страхавых і муніцыпальных медыцынскіх установах. У афіцыйных справаздачах стан шпітальнай справы характарызаваўся як катастрафічны: *“*[пацыент] *не можа доўга ляжаць* [у лякарні] *і пры мінімальным паляпшэнні выпісваецца фактычна хворы чалавек, бо не мае сродкаў разлічыцца за высокую таксу лячэння”* [4, k. 10]. У такіх умовах дзейнасць дабрачынных устаноў і асабліва Чырвонага Крыжа набыла асаблівую значнасць для падтрымання аховы здароўя насельніцтва Заходняй Беларусі.

Асноўнымі мерапрыемствамі Чырвонага Крыжа на тэрыторыі Заходняй Беларусі з’яўлялася стварэнне ўласных санітарных атрадаў, ратаўнічых пунктаў, санітарнага транспарту, устаноў хуткай медыцынскай дапамогі і нават амбулаторый і шпіталяў. Напрыклад, у Беластоку, дзе мясцовы камітэт Чырвонага Крыжа меў багатую гісторыю, пачынаючы з 1877 г., у міжваенны час таварыства ажыццяўляла буйныя праекты ўдасканалення медыка-санітарнай сеткі, напрыклад арганізавала лякарню імя каралевы Лізаветы Бельгійскай, якая па словах прадстаўніка YMCA* у Польшчы П. Сандэрса была *“...прыкладам нават для ўзорных амерыканскіх шпіталяў”* [5, s. 2].

Асаблівасцю дзейнасці Польскага Чырвонага Крыжа на тэрыторыі Заходняй Беларусі было выкарыстоўванне рэсурсаў мясцовых вайсковых кантынгентаў. Варта растлумачыць, што нарастаўшая ў 1930-я гг. абвастранасць міждзяржаўных адносін у Цэнтральна-Усходняй Еўропе падштурхоўвала польскае ваенна-палітычнае кіраўніцтва Польшчы ўзмацніць падрыхтоўку да баявых дзеянняў, у першую чаргу на ўсходніх межах. Пры планаванні баявых дзеянняў значная ўвага надавалася таксама супрацоўніцтву войска з Чырвоным Крыжам: з лютага 1932 г. пры Дэпартаменце здароўя Міністэрства вайсковых спраў стаў дзейнічаць урадавы дэлегат па справах Польскага Чырвонага Крыжа. Падобнае супрацоўніцтва дазваляла выкарыстоўваць рэсурсы вайскоўцаў, якія, ў адрозненне ад службы аховы здароўя, фінансаваліся па прыярытэтным прынцыпе.

Трэба адзначыць, што склад мясцовых аддзелаў Чырвонага Крыжа на тэрыторыі Заходняй Беларусі часцяком уключаў прадстаўнікоў адміністрацыі і вайскоўцаў, якія з’яўляліся кіраўнікамі раскватараваных на “крэсах” аддзелаў польскіх узброеных сіл і прыцягвалі частку вайсковых рэсурсаў для выканання мэт Чырвонага Крыжа. На практыцы гэта выяўлялася ў выкарыстанні аддзеламі Чырвонага Крыжа вайсковых санітарных аўтамабіляў, а таксама інфраструктуры для іх абслугоўвання.

***Заключэнне***

Ва ўмовах хранічнага крызісу дзяржаўнай сістэмы аховы здароўя дзейнасць аддзелаў Польскага Чырвонага Крыжа ў Заходняй Беларусі насіла хоць абмежаваны, але вельмі значны ўнёсак у падтрыманне належнага стану медыцынскага абслугоўвання насельніцтва шляхам утрымання ўласных лякарань, санітарных атрадаў і нават станцый хуткай медыцынскай дапамогі. Характэрнай асаблівасцю дзейнасці Чырвонага Крыжа на тэрыторыі Заходняй Беларусі стала выкарыстанне рэсурсаў раскватараваных на “крэсах” вайскоўцаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Ленинские декреты по здравоохранению / под ред. Ю. А. Ахапкина. — 2-е изд. доп. — М. : Медицина, 1980. — 512 с.
2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. — Ф. 5. — Воп. 1. — Спр. 676.
3. Statut Polskiego Towarzystwa Czerwonego Krzyża. — Warszawa: [s. n.], 1919. — 15 s.
4. Archiwum Akt Nowych w Warszawie. — Z. 15. — Sygn. 786.
5. Dziennik Białostocki. — 1921. — Nr. 115.

* Young Men`s Christian Association — Юнацкая Хрысціянская Асацыяцыя (перакл. аўт.).



Репозиторий ГомГМУ